# 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

## 1.1. Мэты і задачы курса

Вучэбная (рабочая) праграма па курсу «Гісторыя і тэорыя крыніцазнаўства” складзена ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам для першай ступені вышэйшай адукацыі, зацверджаным і ўведзеным у дзеянне пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 12.06.2008 г., № 50 і ў адпаведнасці з вучэбнай базавай праграмай па курсе.

Згодна з адукацыйным стандартам для першай ступені вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці “Гісторыя”, выпускнік, які засвоіў курс “Гісторыя і тэорыя крыніцазнаўства”, павінен

**ведаць:**

- вызначэнне паняцця “гістарычная крыніца” і яе прыроду,
- асноўныя этапы развіцця крыніцазнаўства як спецыяльнай гістарычнай дысцыпліны,
- асноўныя этапы і метады гістарычнай крытыкі крыніц.

**умець:**

- класіфікаваць, сістэматызаваць і аналізаваць крыніцы,
- выкарыстоўваць асноўныя і сучасныя метады даследавання крыніц,
- валодаць прыёмамі крыніцазнаўчага даследавання.

У адпаведнасці з гэтым **мэтай выкладання дадзенага курса** з’яўляецца фармаванне ў выпускнікоў комплексу ведаў аб гістарычных крыніцах, іх прыродзе і социякультурных функцыях, а таксама навыкаў працы з імі.

**Задачы курса:**

- засвойванне выпускнікамі паняцця “гістарычная крыніца” і ведаў аб яе прыродзе,
- вывучэнне асноўных этапаў развіцця крыніцазнаўства як спецыяльнай гістарычнай дысцыпліны
- вывучэнне асноўных этапаў і прыёмаў гістарычнай крытыкі крыніц
- фармаванне ў выпускніка ведаў і ўменняў, звязаных з пошукам, класіфікацыяй, аналізам, інтэрпрэтацыяй гістарычных крыніц, прымяненнем традыцыйных і сучасных метадаў іх даследавання.

## 1.2. Структура і змест курса

Выкладанне курса разлічана на 122 вучэбных гадзіны, з якіх 50 аудыторных, размеркаванне якіх па відах заняткаў уключае 30 лекцый і 20 практычных заняткаў.

У аснове структуравання зместу вучэбнага матэрыялу дадзенай дысцыпліны пакладзены прынцып модульнага падыходу, які прадугледжвае разбіўку вучэбнага матэрыяла на адносна самастойныя модулі. Па кожнаму модулю ў адпаведнасці з яго мэтамі і задачамі па фармаванню канкрэтных кампетэнцый у студэнтаў выкладчыкам (кафедрай) праектуюцца і рэалізуюцца пэўныя педагагічныя тэхналогіі.

З ліку найбольш перспектыўных сучасных інавацыйных адукацыйных сістэм і тэхналогій неабходна выдзеліць: вучэбна-метадычныя комплексы, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы студэнтаў, блочна-модульныя, модульна-рэйтынгавыя і крэдытныя сістэмы, інфармацыйныя тэхналогіі, методыкі актыўнага навучання.

## 1.3. Роля і месца курса ў працэсе фарміравання каметэнцый выпускніка

Выкладанне курса "Крыніцазнаўства гісторыі Беларусі" павінна садзейнічаць развіццю ў выпускніка наступных **кампетэнцый:**

**акадэмічных:**

- валоданне базавымі навукова-тэарэтычнымі ведамі і прымяненне іх для рашэння тэарэтычных і практычных задач,
- валоданне сістэмным і параўнаўчым аналізам,
- валоданне даследчыцкімі навыкамі,
- уменне працаваць самастойна,
- мець навыкі, звязаныя з выкарыстаннем тэхнічных сродкаў, кіраваннем інфармацыяй і работай з камп'ютэрам

**сацыяльна-асобасных:**

- наяўнасць пачуцця патрыятызму, паважлівага стаўлення да гістарычнага мінулага,
- здольнасць да сацыяльнага ўзаемадзеяння і міжасабовай камунікацыі,
- уменне працавацьу калектыве,

- здольнасць да самастойнага навучання,

- уменне прымяняць атрыманыя веды

**прафесійных:**

- здольнасць фармуляваць і рашаць задачы, якія ўзнікаюць у ходзе навукова-даследчай і педагагічнай дзейнасці,

- уменне выкарыстоўваць неабходныя метады даследавання, мадыфікаваць існуючыя і ствараць новыя, зыходзячы з задач канкрэтнага даследавання,

- уменне арганізоўваць працу на навуковай аснове, валоданне камп’ютэрнымі метадамі пошуку, захавання і апрацоўкі інфармацыі у сферы прафесійнай дзейнасці,

- уменне весці справаздачну, навуковую дакументацыю,

- уменне дыялектычна мысліць і аргументаваць свой пункт погляду, аналізаваць факты і прагназаваць развіццё падзей,

- аналізаваць гістарычныя і сучасныя праблемы, звязаныя са сферай крыніцазнаўства,

- рэдагаваць, рэферыраваць і рэцэнзіраваць тэксты,

- мець веды і практычны вопыт для кансультавання ў пытаннях вывучэння гісторыі, арганізацыі даследчай працы і выхаваўчага працэсу.

## 1.4. Кіруемая самастойная работа студэнта.

Кіруемая самастойная работа студэнтаў (КСРС) – унармаваная, мэтанакіраваная вучэбная дзейнасць студэнта, якая ажыццяўляецца пад непасрэдным ці апасродкаваным кіраўніцтвам выкладчыка.

Кампетэнтасны падыход прадугледжвае істотнае ўзмацненне практыкаарыентаванасці адукацыйнага працэсу і ролі кіруемай самастойнай дзейнасці студэнтаў па вырашэнні задач і сітуацый, што імітуюць сацыяльна-асобасныя і сацыяльна-прафесійныя праблемы. Мэтай кіруемай самастойнай работы студэнтаў з’яўляецца павышэнне канкурэнтаздольнасці выпускнікоў ВНУ пасродкам фарміравання у іх кампетэнцый самаадукацыі.

КСРС плануецца ў межах вучэбных гадзін на дысцыпліну, адведзеных на аудыторныя заняткі (не менш 20% ад іх аб’ёму). Вучэбныя гадзіны на КСРС размяркоўваюцца па раздзелах і тэмах па меркаванню выкладчыка (кафедры).

КСРС прадугледжвае выкананне кантрольных работ, падрыхтоўку рэфератаў, азнаямленне з навуковай, навукова-папулярнай, вучэбнай, хрэстаматыйнай літаратурарай (веданне тэкстаў першакрыніц), напісанне эсэ, выкананне вучэбна-даследчых работ і творчых заданняў.

Агульныя патрабаванні да КСРС вызначаюцца палажэннямі і метадычнымі рэкамендацыямі Міністэрства адукацыі, Вучэбна-метадычных аб’яднанняў і вышэйшых навучальных устаноў.

## 2. ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### 2.1.Лекцыйны курс

| № п/п | Назвы раздзелаў і тэм лекцый, іх змест | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 1. | **Прадмет і змест крыніцазнаўства. Вызначэнне гістарычнай крыніцы** | |
| | **1.1. Крыніцазнаўства і яго месца ў сістэме гуманітарных навук**. Гістарычная навука і крыніцазнаўства. Аб'ект і прадмет крыніцазнаўства. Вызначэнне гістарычнай крыніцы. Гістарычная крыніца і гістарычны дапаможнік. Гістарычны факт і крыніца. Месца крыніцазнаўства ў сістэме навук: архівазнаўства, музеязнаўства, бібліяграфіі, інфарматыкі. Методыка і метадалогія крыніцазнаўства. Тэарэтычнае і прыкладное крыніцазнаўства. Крыніцазнаўства гісторыі і іншых навук, іх суадносіны. Гістарычная крыніца як аснова вызначэння міждысцыплінарнага сінтэзу. Метады гістарычнай навукі. Метадалогія і крыніцазнаўства.<br>**1.2. Прырода гістарычнай крыніцы.** Крыніца — адзінства аб'ектыўнага і суб'ектыўнага. Геаграфічнае асяроддзе як спецыфічная крыніца аб мінулым. Пазнавальная функцыя гістарычнай крыніцы. Крыніца і гістарычная свядомасць грамадства.<br>Гістарычная крыніца і дапаможнік. Археалагічныя крыніцы. Музейны экспанат. Вызначэнне «гістарыяграфічнай крыніцы». | 4 |
| 2. | **Гісторыя крыніцазнаўства** | |
| | **2.1. Перадумовы зараджэння крыніцазнаўства як навукі.** Элементы гістарычнай крытыкі ў працах антычных аўтараў. Гістарычная крыніца ў творах сярэдневякоўя. Ідэі Адраджэння і станаўленне рацыяналістычнай крытыкі гістарычных крыніц.<br>**2.2. Асноўныя этапы развіцця крыніцазнаўства ў новы час.** Крытыка тэкстаў гістарычных крыніц Італіі. Выданні крыніц у Францыі, Англіі, Германіі. Зараджэнне расійскай школы крыніцазнаўства. Развіццё крыніцазнаўства ў Расійскай імперыі. Назапашванне практычнага вопыту работы з крыніцамі па гісторыі феадалізму. Неабходнасць асэнсавання гістарычных крыніц у канцы XIX — пачатку XX ст. Распрацоўка тэорыі і методыкі гістарычнага крыніцазнаўства. Стварэнне першых навучальных дапаможнікаў і манаграфій па пытаннях крыніцазнаўства. Ш.-В. Ланглуа, Ш. Сеньабос. В. В. Ключэўскі. Распрацоўка тэорыі і методыкі крыніцазнаўства. А. С. Лаппо-Данілеўскі. | 6 |

| | | |
|---|---|---|
| | **2.3. Развіццё крыніцазнаўства ў навейшы час.** Дыскусіі аб сутнасці гісторыі і ролі гістарычных крыніц. М. Блок. Распрацоўка тэорыі крыніцазнаўства савецкімі гісторыкамі. С.О. Шміт, В.М. Медушэўская і інш. Колькасныя метады вывучэння крыніц І.Д. Кавальчанка. Распрацоўка крыніцазнаўства гісторыі Беларусі. Дз.І. Даўгяла, У.І. Пічэта, М.М. Улашчык і інш. | |
| 3. | **Класіфікацыя і сістэматызацыя крыніц** | |
| | **3.1. Класіфікацыя і сістэматызацыя крыніц: Агульная характарыстыка.** Класіфікацыя, яе сутнасць і мэты. Крытэрыі класіфікацыі. Класіфікацыя і сістэматызацыя. Віды сістэматызацыі. Паняцці «тып» і «від» у класіфікацыі, іх суадносіны. Спробы класіфікацыі гістарычных крыніц на «рэшткі» і «паданні».<br>**3.2. Разнастайныя спосабы класіфікацыі крыніц.** Фіксаваная і нефіксаваная сацыяльная інфармацыя. Падзел крыніц паводле спосабу фіксавання інфармацыі на рэчавыя, пісьмовыя, вусныя, этнаграфічныя, лінгвістычныя, фотакінадакументы, фонадакументы. Адлюстраванне ў крыніцы фіксаванай інфармацыі. Класіфікацыя крыніц іх паходжання і віда.<br>Падзел крыніц паводле форм адлюстравання рэчаіснасці. Рэчавыя, пісьмовыя, фанічныя, выяўленчыя (выяўленча-графічныя, выяўленча-мастацкія, выяўленча-натуральныя) крыніцы. «Вусная гісторыя» і яе крыніцы.<br>Тыпалагічныя класіфікацыі ў залежнасці ад знешніх прыкмет крыніц. Класіфікацыя С. О. Шмідта. Падзел крыніц на рэчавыя, выяўленчыя, моўныя, канвенцыянальныя, крыніцы паводзін і гукавыя (аўдыяльныя).<br>**3.3. Пісьмовыя крыніцы, іх роля ў вывучэнні гісторыі.** Класіфікацыя пісьмовых крыніц. Дакументальныя і апавядальныя крыніцы, іх асноўныя віды.<br>Заканадаўчыя дакументы як гістарычныя крыніцы. Зараджэнне і станаўленне заканадаўства. Заканадаўства новага часу (XVI — пачатак XX ст.). Заканадаўства навейшага часу. Аналіз заканадаўчых дакументаў.<br>Акты як гістарычныя крыніцы. Вызначэнне. Асноўныя віды. Методыка вывучэння актаў.<br>Справаводчыя матэрыялы як гістарычная крыніца. Вызначэнне. Асноўныя рысы статыстычных крыніц і прынцыпы выкарыстання. Асноўныя стадыі фарміравання статыстычных крыніц.<br>Апавядальныя крыніцы. Агульная характарыстыка.<br>Летапісы і хронікі як гістарычныя крыніцы. Тэрміналогія летапісання. Асноўныя асаблівасці вывучэння і этапы развіцця летапісання.<br>Мемуары. Вызначэнне. Асноўныя віды мемуарнай | 6 |

| | | |
|---|---|---|
| | літаратуры і іх вывучэнне.<br>Эпісталярныя крыніцы. Агульная характарыстыка. Вывучэнне эпісталярнага комплексу.<br>Літаратурныя і публіцыстычныя творы як гістарычныя крыніцы. Вызначэнне, асноўныя этапы. Асаблівасці жанру мастацкай літаратуры.<br>Перыядычны друк як спецыфічная сістэма гістарычных крыніц. | |
| 4. | **Крыніцазнаўчая эўрыстыка.** | |
| | **4.1. Паняцце і асноўныя этапы крыніцазнаўчай эўрыстыкі.** Пошук гістарычных крыніц. Задача эўрыстыкі. Выяўленне і адбор.<br>**4.2. Бібліяграфічная і архіўная эўрыстыка.** Пошук апублікаваных крыніц. Звесткі аб публікацыях гістарычных крыніц. Перавагі і недахопы публікацыі. Гістарычная бібліяграфія. Асаблівасці пошуку гістарычных крыніц у сетцы Internet.<br>Выяўленне крыніц у архівах. Элементы выпадковасці ў іх пошуку. Падрыхтоўчая работа да наведвання архіваў. Складанне спісаў архіваў, фондаў, фондаўтваральнікаў. Вывучэнне навукова-даведачнага апарату архіваў, вопісаў фондаў. Вывучэнне спраў. Пошук і сістэматызацыя крыніц. Складанне і збор рабочых матэрыялаў для афармлення работы. | **4** |
| 5. | **Гістарычная крытыка крыніц** | |
| | **5.1. Паняцце і асноўныя этапы гістарычнай крытыкі крыніц. Вывучэнне тэксту крыніцы.** Асноўныя этапы гістарычнай крытыкі. Агульная характарыстыка.<br>Устанаўленне тэксту. Прачытанне і асэнсаванне зместу тэксту. Значэнне кантэксту для разумення граматычных норм і лексічнага зместу крыніцы. Гісторыя тэксту, задачы яе вывучэння. Паняцце рэдакцыі, спісу, ізводу. Інтэрпаляцыі і глосы. Этапы стварэння дакументаў: чарнавікі, белавікі, копіі. Аднаўленне арыгінала паводле тэксту ў некалькіх спісах, ізводах, рэдакцыях. Рэканструкцыя тэкстаў.<br>Вывучэнне паходжання тэксту. Агульная характарыстыка.<br>**5.2. Дацыроўка, атрыбуцыя і лакалізацыя крыніцы.** Вызначэнне часу ўзнікнення крыніцы. Паняцці «каляндар», «эра». Аналіз непасрэднай і ўскоснай інфармацыі аб часе. Сінтэз інфармацыі аб часе. Адлік часу ад вядомай падзеі. Вывучэнне формы дакумента. Дапасаванне звестак з іншых крыніц.<br>Методыка лакалізацыі ўзнікнення крыніц. Выкарыстанне дадзеных гістарычнай геаграфіі. Спалучэнне звестак графічных і пісьмовых помнікаў. Аналіз непасрэднай і ўскоснай прасторавай інфармацыі, яе сінтэз. Тапонімы і | **6** |

| | | |
|---|---|---|
| | мікратапонімы, этнонімы і інш.<br>Атрыбуцыя. Улік непасрэдных звестак. Прозвішча, імя, мянушка. Раскрыццё крыптонімаў, псеўданімаў. Ананімныя крыніцы і іх атрыбуцыя. Новыя метады ўстанаўлення аўтарства з выкарыстаннем колькасных метадаў і інфармацыйных тэхналогій.<br>**5.3. Інтэрпрэтацыя і ўнутраная крытыка крыніцы.** Інтэрпрэтацыя гістарычнай крыніцы, яе адрозненне ад граматычнага прачытання тэксту. Гістарызмы, архаізмы, тлумачэнне паняццяў. Тэрміналагічны аналіз. Вытлумачэнне заканадаўчых крыніц. Выкарыстанне юрыдычнай тэрміналогіі. Вытлумачэнне актаў. Склад актавага фармуляра. Вытлумачэнне апавядальных крыніц. Вывучэнне непасрэднага зместу тэксту, алегорый, іншаказанняў. Веданне канкрэтных гістарычных абставін стварэння крыніцы.<br>Выяўленне падложных і падробных крыніц. Магчымыя мэты іх стварэння. Спосабы выяўлення інтэлектуальнага падлогу.<br>Асаблівасці вывучэння рэчавых крыніц. Прымяненне метадаў іншых навук.<br>Вывучэнне інфармацыі гістарычнай крыніцы. Мэты і задачы ўнутранай крытыкі крыніц. Паняцце аб верагоднасці. Паўната і дакладнасць інфармацыі.<br>Метады выяўлення навуковай каштоўнасці розных відаў пісьмовых крыніц. Крыніца і гістарычны кантэкст.<br>Вывучэнне ўплыву ўмоў, у якіх узнікае інфармацыя, на яе паўнату і дакладнасць. Аналіз сведчанняў, што заснаваны на асабістым назіранні. Крытыка звестак, якія атрыманы з іншых крыніц і абагульненняў. Вызначэнне сацыяльных, палітычных і групавых пазіцый аўтара, іх уплыў на змешчаную ў крыніцы інфармацыю. Метады канчатковага ўстанаўлення каштоўнасці інфармацыі: праверка паўнаты, верагоднасці і дакладнасці інфармацыі адпаведнай крыніцы.<br>Паняцце сінтэзу інфармацыі крыніцы. Сінтэз гістарычнай інфармацыі, яго сутнасць і мэты. Супастаўленне звестак, атрыманых на этапе ўнутранай і знешняй крытыкі. Вызначэнне ўзаемасувязі і ўзаемаўплываў. Пабудова генеалагічнага раду крыніц. Паняцце рэпрэзентатыўнасці. | |
| **6.** | **Асноўныя метады даследавання гістарычных крыніц** | |
| | **6.1. Агульна-навуковыя і спецыяльна-гістарычныя метады.** Агульная характарыстыка метадаў даследавання гістарычных крыніц. Метадалогія крыніцазнаўства ў працах А.С. Лапо-Данілеўскага і І.Д. Кавальчанка. Выкарыстанне агульнанавуковых метадаў у крыніцазнаўстве. Аналіз, сінтэз, узыходжанне ад канкрэтнага да абстрактнага, метад класавага аналізу, індукцыя, дэдукцыя. | **4** |

| | | |
|---|---|---|
| | Спецыяльна-гістарычныя метады даследавання крыніц — гісторыка-генетычны, гісторыка-тыпалагічны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-сістэмны.<br>**6.2. Інавацыйныя метады даследавання крыніц.** Неабходнасць у павышэнні інфарматыўнасці крыніц. Крыніца ў свеце тэорыі інфармацыі. Выкарыстанне ў крыніцазнаўстве колькасных метадаў і інфармацыйных (камп'ютэрных) тэхналогій. Масавыя крыніцы і метады іх апрацоўкі.<br>Магчымасці і абмежаванні выкарыстання колькасных метадаў і інфармацыйных (камп'ютэрных) тэхналогій у апрацоўцы апавядальных крыніц. Мадэліраванне аўтарскага стылю і вызначэнне складанага характару тэксту крыніцы. Інфармацыйны пошук лакун, купюр, інкарпарацый, экстрапаляцый і пазнейшых уставак.<br>Метады семіётыкі пры вывучэнні гістарычных крыніц. Знакі і сімвалы як аб'екты вывучэння семіётыкі. Даследаванне культурных кодаў і камунікатыўных сістэм навукоўца-гісторыка і аўтараў крыніц. Вызначэнне дыскурсаў у тэкстах крыніц. Выкарыстанне метаду дэканструкцыі.<br>Сацыяльна-псіхалагічныя метады вывучэння гістарычных крыніц. Выкарыстанне дасягненняў гістарычнай псіхалогіі і псіхагісторыі ў даследаванні крыніц. | |
| | **Усяго** | **30** |

## 2.2.Семінарскія заняткі.

| № п/п | Назва тэм семінарскіх заняткаў  і іх змест | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 1 | **Прадмет і змест крыніцазнаўства. Вызначэнне гістарычнай крыніцы**<br>1. Гістарычная навука і крыніцазнаўства. Аб’ект і прадмет крыніцазнаўства.<br>2. Крыніца — адзінства аб’ектыўнага і суб’ектыўнага.<br>3. Гістарычная крыніца і дапаможнік | **2** |
| 2 | **Гісторыя крыніцазнаўства.**<br>1.Асноўныя этапы развіцця крыніцазнаўства.<br>2. Выданні крыніц у Францыі, Англіі, Германіі.<br>3. Зараджэнне і развіццё крыніцазнаўства ў Расійскай дзяржаве.<br>4. Дыскусіі аб сутнасці гісторыі і ролі гістарычных крыніц у замежнай і савецкай навуцы.<br>5. Распрацоўка крыніцазнаўства гісторыі Беларусі. | **4** |
| 3 | **Класіфікацыя і сістэматызацыя крыніц**.<br>1. Класіфікацыя, яе сутнасць і мэты.<br>2. Класіфікацыя крыніц паводле спосабу фіксацыі інфармацыі і форм адлюстравання рэчаіснасці.<br>3. Класіфікацыя С.О. Шмідта.<br>4. Класіфікацыя пісьмовых крыніц.<br>5. Заканадаўчыя і  актавыя  дакументы як гістарычныя крыніцы.<br>6. Матэрыялы справаводства і статыстыкі як гістарычныя крыніцы.<br>7. Летапісы і хронікі як гістарычныя крыніцы<br>8. Мемуарныя, літаратурныя і публіцыстычныя творы як гістарычныя крыніцы.<br>9. Эпісталярныя крыніцы.<br>10. Матэрыялы перыядычнага друку як спецыфічная сістэма гістарычных крыніц. | **6** |
| 5 | **Гістарычная крытыка крыніц.**<br>1. Асноўныя этапы гістарычнай крытыкі.<br>2. Этапы стварэння дакументаў.<br>3. Рэканструкцыя тэкстаў.<br>4. Вывучэнне паходжання тэксту.<br>5. Аналіз і сінтэз непасрэднай і ўскоснай інфармацыі аб часе стварэння крыніцы.<br>6. Методыка лакалізацыі ўзнікнення крыніц.<br>7. Атрыбуцыя.<br>8. Інтэрпрэтацыя гістарычнай крыніцы.<br>9. Паняцце сінтэзу інфармацыі крыніцы. | **4** |

| | | |
|---|---|---|
| 6 | **Асноўныя метады даследавання гістарычных крыніц.**<br>1. Метадалогія крыніцазнаўства ў працах А.С. Лапо-Данілеўскага і І.Д. Кавальчанка.<br>2.Спецыяльна-гістарычныя метады даследавання крыніц.<br>3. Інавацыйныя метады даследавання крыніц.<br>4. Выкарыстанне колькасных метадаў і інфармацыйных (камп’ютэрных) тэхналогій у апрацоўцы апавядальных крыніц.<br>5.Сацыяльна-псіхалагічныя метады вывучэння гістарычных крыніц. | **4** |
| | **Усяго:** | **20** |

# 3. ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Нумар раздзела, тэмы, занятка | Назва раздзела, тэмы, занятка, пералік вывучаемых пытанняў | Колькасць аудыторных гадзін | | | | Матэрыяльнае забеспячэнне занятка (наглядныя, метадычныя дапаможнікі і інш.) | Літаратура | Формы кантрол. ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | практычныя (семинарскія) заняткі | Лабараторныя заняткі | кіруемая (контралюемая) самастойная работа студэнта | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| **1.** | **Прадмет і змест крыніцазнаўства. Вызначэнне гістарычнай крыніцы.** | | | | | | | |
| 1.1. | Крыніцазнаўства і яго месца ў сістэме гуманітарных навук.<br>1. Аб'ект і прадмет крыніцазнаўства.<br>2. Месца крыніцазнаўства ў сістэме гуманітарных навук.<br>3. Методыка і метадалогія крыніцазнаўства.<br>4. Тэарэтычнае і прыкладное крыніцазнаўства. | 2 | 1 | | | ВМК, М-1-2 | [1-5], [6], [9], [11], [12], [17-21] | Тэст |
| 1.2. | Вызначэнне і прырода гістарычнай крыніцы.<br>1. Паняцце гістарычнай крыніцы. Гістарычная крыніца і гістарычны дапаможнік.<br>2. Прырода гістарычнай крыніцы. Адзінства аб'ектыўнага і суб'ектыўнага ў крыніцы.<br>3. Паняцці "археалагічная крыніца", "рэчавая крыніца", "музейны прадмет", "музейны экспанат" | 2 | 1 | | | ВМК, М-1-2 | [1-5], [7-10], [12-21] | Самастойная работа |
| **2.** | **Гісторыя крыніцазнаўства.** | | | | | | | |
| 2.1. | Перадумовы зараджэння крыніцазнаўства як навукі.<br>1. Элементы гістарычнай крытыкі ў працах антычных аўтараў.<br>2. Гістарычная крыніца ў творах сярэдневякоўя.<br>3. Ідэі Адраджэння і станаўленне рацыяналістычнай крытыкі гістарычных крыніц. | 2 | | | | ВМК, М-3 | [1-5], [22-45], | Рэферат |
| 2.2. | Асноўныя этапы развіцця крыніцазнаўства ў Новы час.<br>1. Крытыка тэкстаў і выданні гістарычных крыніц у Італіі, Францыі, Германіі.<br>2. Зараджэнне і развіццё крыніцазнаўства ў Расійскай імперыі.<br>3. Стварэнне першых навучальных дапаможнікаў і | 2 | 2 | | | ВМК, М-3 | [1-5], [22-45] | Рэферат |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | манаграфій па пытаннях крыніцазнаўства.<br>4. Распрацоўка тэорыі і методыкі крыніцазнаўства. | | | | | | | |
| 2.3. | Развіццё крыніцазнаўства ў навейшы час.<br>1. Дыскусіі аб сутнасці гісторыі і ролі гістарычных крыніц у працах прадстаўнікоў “Школы Аналаў”.<br>2. Распрацоўка тэорыі і методыкі крыніцазнаўства савецкімі гісторыкамі.<br>3. Распрацоўка крыніцазнаўства гісторыі Беларусі. | 2 | 2 | | | ВМК, М-3 | [1-5], [22-45] | Даклад |
| **3.** | **Класіфікацыя і сістэматызацыя крыніц** | | | | | | | |
| 3.1. | Класіфікацыя і сістэматызацыя крыніц: агульная характарыстыка.<br>1. Класіфікацыя, яе сутнасць і мэты.<br>2. Сістэматызацыя крыніц, віды сістэматызацыі.<br>3. Паняцці “тып” і “від” у класіфікацыі, іх суадносіны.<br>4. Спробы класіфікацыі на “рэшткі” і “паданні”. | 2 | 2 | | | ВМК, М-4-5 | [1-5], [46-50] | Тэст |
| 3.2. | Разнастайныя спосабы класіфікацыі крыніц<br>1. Падзел крыніц паводле спосабу фіксацыі інфармацыі.<br>2. Падзел крыніц паводле форм адлюстравання рэчаіснасці.<br>3. Класіфікацыя С. О. Шмідта. | 2 | 2 | | | ВМК, М-4-5 | [1-5], [46-50] | Самастойная работа |
| 3.3. | Пісьмовыя крыніцы, іх роля ў вывучэнні гісторыі<br>1. Класіфікацыя пісьмовых крыніц, іх асноўныя роды і віды.<br>2. Заканадаўчыя і актавыя матэрыялы як гістарычныя крыніцы.<br>3. Матэрыялы справаводства і статыстыкі як гістарычныя крыніцы.<br>4. Летапісы і хронікі як гістарычныя крыніцы.<br>5. Мемуары, літараратурныя і публіцыстычныя творы як гістарычныя крыніцы.<br>6. Эпісталярныя крыніцы.<br>7. Перыядычны друк як спецыфічная сістэма гістарычных крыніц. | 2 | 2 | | | ВМК, М-4-5 | [1-5], [46-50] | Тэст |
| **4.** | **Крыніцазнаўчая эўрыстыка** | | | | | | | |
| 4.1. | Паняцце і асноўныя этапы крыніцазнаўчай эўрыстыкі.<br>1. Пошук, выяўленне і адбор гістарычных крыніц як важнейшыя этапы навуковага даследавання.<br>2. Паняцце і сутнасць крыніцазнаўчай эўрыстыкі.<br>3. Бібліяграфічная і архіўная эўрыстыка: агульная характарыстыка. | 2 | | | | ВМК, М-6 | [1-5], [52], [62], [64-66] | Самастойная работа |
| 4.2. | Бібліяграфічная і архіўная эўрыстыка. | 2 | | | | ВМК, М-6 | [1-5], [51], [53-61], | Самастойная |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1. Пошук апублікаваных крыніц. Гістарычная бібліяграфія.<br>2. Выяўленне крыніц у архівах і методыка працы з імі. Навукова-даведачны апарат архіва.<br>3. Асаблівасці пошуку крыніц у Internet. | | | | | | [63], [67-68]. | работа |
| **5.** | **Гістарычная крытыка крыніц** | | | | | | | |
| | Паняцце і асноўныя этапы гістарычнай крытыкі крыніц. Вывучэнне тэксту крыніцы.<br>1. Паняцце гістарычнай крытыкі крыніц.<br>2. Знешняя і ўнутраная крытыка крыніцы: агульная характарыстыка.<br>3. Вывучэнне тэксту крыніцы. | 2 | | | | ВМК, М-7 | [1-5], [70], [74], | Франтальнае апытанне |
| | Даціроўка, атрыбуцыя і лакалізацыя крыніцы.<br>1. Вызначэнне часу ўзнікнення крыніцы.<br>2. Методыка лакалізацыі стварэння крыніцы.<br>3. Атрыбуцыя крыніцы. | 2 | 2 | | | ВМК, М-7 | [1-5], [69], [71-103] | Тэст |
| | Інтэрпрэтацыя і ўнутраная крытыка крыніцы.<br>1. Інтэрпрэтацыя гістарычнай крыніцы.<br>2. Выяўленне падробных крыніц, асноўныя прычыны фальсіфікацыі крыніц.<br>3. Вывучэнне інфармацыі гістарычнай крыніцы. Паняцце паўнаты і дакладнасці інфармацыі.<br>4. Паняцце сінтэзу гістарычнай крыніцы, яго сутнасць і мэты. | 2 | 2 | | | ВМК, М-7 | [1-5], [69-103]. | Тэст |
| **6.** | **Асноўныя метады даследавання гістарычных крыніц.** | | | | | | | |
| 6.1. | Агульнанавуковыя і спецыяльна-гістарычныя метады даследавання гістарычных крыніц.<br>1. Аналіз і сінтэз.<br>2. Індукцыя і дэдукцыя.<br>3. Узыходжанне ад канкрэтнага да абстрактнага і ад абстрактнага да канкрэтнага.<br>4. Гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-тыпалагічны і гісторыка-сістэмны метады. | 2 | 2 | | | ВМК, М-9 | [1-5], [109] | Франтальнае апытанне |
| 6.2 | Інавацыйныя метады даследавання крыніц.<br>1. Крыніца ў святле тэорыі інфармацыі.<br>2. Выкарыстанне колькасных метадаў і камп’ютэрных тэхналогій пры даследаванні гістарычных крыніц.<br>3. Метады семіётыкі пры вывучэнні гістарычных крыніц.<br>4. Сацыяльна-псіхалагічныя метады вывучэння гістарычных крыніц. | 2 | 2 | | | ВМК, М-9 | [1-5], [104-112]. | Рэферат |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | **Усяго** | **30** | **20** | | | | | |

## 4. ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

### Асноўная літаратура:

1.Грицкевич В. П., Каун С. Б., Ходин С. Н. Теория и история источниковедения. Мн., 2000.

2.Источниковедение: Теория. История. Метод. Источники Российской истории: Учеб. пособие // И. Н. Данилевский, В. В. Кабанов, О. М. Медушевская, М. Ф. Румянцева. М., 1998.

3.Каун С. Б., Липницкая О. Л., Ходин С. Н. Теория и история источниковедения: Учеб.-метод. комплекс. Мн., 2001.

4.Пронштейн А. П., Задера А. Г. Методика работы над историческими источниками. Учеб.-метод. пособие. М., 1977.

5.Пронштейн А. П. Методика исторического источниковедения. Ростов н/Д, 1976.

### 4.2. Дадатковая літаратура

**Прадмет і змест крыніцазнаўства. Вызначэнне гістарычнай крыніцы**

6. Беленький И. Л. Разработка проблем теоретического источниковедения в исторической науке (1969—1983). М., 1983.

7. Борисенков Е. П. Климат и деятельность человека. М., 1982.

8. Гістарычныя крыніцы: праблемы класіфікацыі, вывучэння і выкладання // Матэрыялы да Міжнар. навук.-практычнай канф., прысвечанай 120-годдзю з дня нараджэння У. І. Пічэты. Мн., 1998.

9. Иванов Г. М. Исторический источник и историческое познание. Томск, 1973.

10. Иванов Г. М. О социальной природе исторического источника // Тр. Томского гос. ун-та. Томск, Т. 11. С. 73—85.

11. Иванов Г. М., Коршунов А. М., Петров Ю. В. Методические проблемы исторического познания. М., 1981.

12. Источниковедение истории СССР / Под ред. И. Д. Ковальченко. М., 1981. С. 5—7.

13.Клейн Л. С. Археологические источники. Л., 1978.

14.Ковальченко И. Д. Методы исторического исследования. М., 1987.

15.Медушевская О. М. Современное зарубежное источниковедение. М., 1983.

16. Проблемы устной истории СССР (тезисы научной конференции). Киев, 1990.

17. Пронштейн А. П., Данилевский И. Н. Вопросы теории и методики исторического исследования. М., 1986.

18. Фарсобин В. В. Источниковедение и его метод. М., 1983.

19. Шмидт С. О. Путь историка: Избр. тр. по источниковедению и историографии. М., 1997.

20. Шмидт С. О. Современные проблемы источниковедения // Источниковедение. Теорет. и методологические проблемы. М., 1969.

21. Шмидт С. О. Проблема взаимодействия общества и природы и некоторые вопросы источниковедения // Общество и природа. М., 1981.

**Гісторыя крыніцазнаўства**

22.Аксенов А. И. Генеалогия // Вопр. истории. 1972. № 10.

23 .Археалогія і нумізматыка Беларусі. Мн., 1993.

23. Богданов А. П. Филиграноведение вчера и сегодня // История и палеография: Сб. статей. М., 1993. Ч. 2. С. 302—432.

24. Генеалогия: источники, проблемы, методы исследования. М., 1989.

25. Добиаш-Рождественская О. А. История письма в средние века: руководство к изучению латинской палеографии. М., 1987.

26. Историческое краеведение Белоруссии. Мн., 1980. С. 201—213.

27. Каменцева Е. И., Устюгов Н. В. Русская сфрагистика и геральдика. М., 1963.

28. Каштанов С. М. Очерки русской дипломатики. М., 1970.

29. Каштанов С. М. Русская дипломатика. М., 1988.

30. Куль-Сяльверстава С. Я. Беларуская палеаграфія: Навуч. дапам. Гродна, 1996.

31. Люблинская А. Д. Латинская палеография. М., 1969.

32. Медушевская О. М. О проблемах генеалогии // Советские архивы. 1989. № 6.

33. Музееведение. Музеи исторического профиля. М., 1988.

34. Нарбут А. Н. Генеалогия Белоруссии. М., 1994. Вып. 2.; М., 1995. Вып.1.

35.Наш радавод. Гродна, 1993. Кн. 5. Ч. 1 (арт. А. Н. Нарбута, Д. В. Карава, А. П. Грыцкевіча).

36. Рейсер С. А. Русская палеография нового времени. М., 1982.

37. Рябцевич В. Н. Нумизматика Беларуси. Мн., 1995.

38. Скурат К. Даўнія беларускія меры. Мн., 1974.

39. Тихомиров М. Н., Муравьев А. В. Русская палеография. М., 1982.

40. Фарсобин В. В. О предмете дипломатики и ее соотношение с источниковедением // Вопр. истории. 1978. № 1.

41. Хорошкевич А. Л. Печати полоцких грамот XIV—XV вв. // Вспомогательные ист. науки. Л., 1972. Кн. 4.

42. Цітоў А. К. Геральдыка беларускіх месцаў. Мн., 1998.

43. Цітоў А. К. Пячаткі старажытнай Беларусі. Мн., 1993.

44. Шкуратов И. А. Историческая психология. М., 1997.

45. Щепкин В. М. Учебник русской палеографии. М., 1918 (перавыдадзены: М., 1967).

**Класіфікацыя і сістэматызацыя крыніц**

46. Евграфов Е. М. Кинофотодокументы как исторический источник. М., 1973.

47. Каштанов С. М. Русская дипломатика. М., 1988.

48. Лаппо-Данилевский А. С. Методология истории. СПб., 1910—1913. Вып. 1—2.

49. Пушкарев Л. Н. Классификация русских письменных источников по отечественной истории. М., 1975.

50. Шмидт С. О. Путь историка: Избр. тр. по источниковедению и историографии. М., 1997.

**Крыніцазнаўчая эўрыстыка**

51. Бібліяграфія па гісторыі Беларусі. Феадалізм і капіталізм. Мн., 1969.

52. Воронин Ю. А. Введение в теорию классификации. Новосибирск, 1982.
53. Глобальная сеть Internet в информационном обеспечении исторических исследований и образования // Е. Б. Белова, Л. И. Бородкин, И. М. Гарскова и др. Ист. информатика. М., 1996. С. 369—373.
54 .Государственные архивы СССР: Справ.: В 2 ч. М., 1989.
55. Дакументы па гісторыі Беларусі, якія зберагаюцца ў Цэнтральных архівах СССР. Мн., 1991.
56. Доорн П. Электронный лабиринт: возможности и «ловушки» компьютерной системы INTERNET для историков // Круг идей: развитие исторической информатики. Тр. II конф. Ассоциации «История и компьютер». М., 1995. С. 122—135.
57. Каралёў Г. І. Польскія публікацыі царкоўна-гістарычных крыніц у XIX—XX ст. // Наш радавод. Гродна, 1992. Кн. 4. Ч. 3. С. 184—190.
58. Каталог сборников документов, изданных архивными учреждениями СССР. 1917—1960. М., 1961.
59. Леонтьева Т. Е. Документальные материалы фонда князей Радзивиллов как исторический источник // Вопр. архивоведения и источниковедения в БССР. Мн., 1971. С. 320—328.
60. Сокольчик А. А. Дооктябрьская книга на русском языке о Белоруссии (1768—1917 гг.): Библиогр. указатель. Мн., 1976.
61. Правила издания исторических документов. М., 1969.
62. Пушкин В. Н. Эвристика — наука о творческом мышлении. М., 1967.
63. Суслова Е. Н. Поиск архивных документов. Л., 1987.
64. Улащик Н. Н. Очерки по источниковедению и археографии истории Беларуси феодального периода. Мн., 1973.
65. Федотов В. В. Техника и организация умственного труда. Мн., 1983.
66. Ходаковский И. И. Организация поиска источников и литературы в источниковедческом исследовании: Учеб. пособие. М., 1976.
67. Центральный государственный исторический архив Белорусской ССР в г. Гродно: Путеводитель. Мн., 1956.
68. Центральный государственный исторический архив БССР в г. Минске: Путеводитель. Мн., 1974.

**Гістарычная крытыка крыніц**

69. Бережков Н. Г. Хронология русского летоисчисления // Проблемы источниковедения. Вып. 6. 1958.
70. Берков П. Н. Введение в технику литературоведческого исследования. Источниковедение. Библиография. Разыскания. Л., 1955.
71. Бикерман Э. Хронология древнего мира. М., 1975.
72. Борисенков Е. П., Пасецкий В. М. Экстремальные явления в русских летописях XI—XVII вв. Л., 1983.
73. Виноградов В. В. Проблемы авторства и теория стилей. М., 1961.
74. Горбачевский Н. Краткия таблицы, необходимые для истории, хронологии, вообще для всякого рода археологических исследований. Вильна, 1867.
75. Ермолаев И. П. Историческая хронология. Казань, 1980.
76. Ефременков Э. Л. Раскрытие авторства на основе анализа идейного содержания произведений // Вопр. текстологии. Вып. 2. М., 1960.

77. Жучкевич В. А. Общая топонимика. Мн., 1980.
78. Жучкевич В. А. Топонимика Белоруссии. Мн., 1968.
79. Каменцева Е. И. Хронология. М., 1982.
80. Климишин И. А. Календарь и хронология. М., 1985.
81. Историческая география СССР // И. Д. Ковальченко и др. М., 1973.
82. Лихачев Д. С. Вопросы атрибуции произведений древнерусской литературы // Тр. Отдела древнерусской литературы АН СССР. Ин-т литературы. М.; Л., 1961. Т. 17.
83. Лихачев Д. С. Текстология. М., 1983.
84. Максаковский В. П. Историческая география мира. М., 1997.
85. Нечкина М. В. Кто автор «Записок» Н. И. Горбачевского? // Ист. зап. М., 1955. Т. 54.
86. Носовский Г. В., Фоменко А. Г. Новая хронология и концепция древней истории Руси, Англии, Рима. Факты, гипотезы. Т. 1. Русь. М., 1995.
87. О принципах определения авторства в связи с общими проблемами теории и истории литературы. Л., 1960.
88. От Нестора до Фонвизина: Новые методы определения авторства / Под ред. Л. В. Милова. М., 1994.
89. Пиотровский Р. Г. Анонимные произведения и их авторы. Мн., 1988. (Предисловие).
90. Пронштейн А. П., Кияшко В. Я. Хронология. М., 1981.
91. Рейсер С. А. Основы текстологии. Л., 1978.
92. Рыбаков Б. А. Петр Бориславич: Поиск автора «Слова о полку Игореве». М., 1997.
93. Рылюк Г. Я. Истоки географических названий Беларуси (с основами общей топонимики). Мн., 1997.
94. Святский Д. О. Астрономические явления в русских летописях с научно-критической точки зрения. Пг., 1915.
95. Статистика текста. Мн., 1969.
96. Хавский П. В. Взгляд на хронологию еврейскую, христианскую вообще и русскую в особенности. СПб., 1849.
97. Ходзін С. М. Летапісанне на Беларусі // Бел. гіст. часоп. 1997. № 2. С. 81—82.
98. Хронология Российской истории: Энцикл. справ. М., 1994.
99. Цыб С. В. Древнерусское времяисчисление в «Повести временных лет». Барнаул, 1995.
100. Черепнин Л. В. Повесть временных лет, ее редакции и предшествующие ей летописные своды // Исторические записки. М., 1948. Т. 25—27.
101. Черепнин Л. В. Русская хронология. М., 1944.
102. Шахматов А. А. Обозрение русских летописных сводов XIV—XVI вв. М., 1972.
103. Щербиновский Н. С. Сезонные явления в природе. М., 1966.

**Асноўныя метады даследавання гістарычных крыніц**

104. Бородкин Л. И., Милов Л. В., Морозова Л. Е. К вопросу о формальном анализе авторских особенностей стиля в произведениях Древней Руси //

Математические методы в историко-экономических и историко-культурных исследованиях. М., 1977. С. 298—326.

105. Бородкин Л. И., Милов Л. В. О некоторых аспектах автоматизации текстологических исследований (Закон Судный людем) // Математические методы в историко-экономических и историко-культурных исследованиях. М., 1977. С. 235—280.

106. Бородкин Л. И. Многомерный статистический анализ в исторических исследованиях. М., 1986.

107. Буховец О. Г. Социальные конфликты и крестьянская ментальность в Российской империи начала XX века: новые материалы, методы, результаты. М., 1996.

108. Ковальченко И. Д. Исторический источник в свете учения об информации (к постановке проблемы) // История СССР. 1982. № 3. С. 129—148.

109. Ковальченко И. Д. Методы исторического исследования.

110. Количественные методы в исторических исследованиях / Под ред. И. Д. Ковальченко. М., 1984.

111. Липницкая О. Л., Кудряшов В. Е. Компьютерное источниковедение в Беларуси: некоторые итоги и проблемы // Информ. бюллетень ассоциации «История и компьютер». 1997. № 21. С. 167—171.

112. Моисеенко Т., Свищев М. Изучение аграрной России последних десятилетий: перспективы «компьютерного источниковедения» // История и компьютер: Новые информационные технологии в исторических исследованиях и образовании. Геттинген, 1993. С. 151—167.

## 4.3. Прыкладныя пытанні да экзамена

1. Вызначэнне крыніцазнаўства, яго аб'ект, прадмет і функцыі.
2. Паняцце гістарычнага факта і падыходы да яго вытлумачэння.
3. Выкарыстанне метадаў дыпламатыкі і сфрагістыкі для аналіза гістарычных крыніц.
4. Выкарыстанне дадзеных гістарычнай метралогіі пры вывучэнні гістарычных крыніц.
5. Метады палеаграфіі пры даследаванні гістарычных крыніц.
6. Выкарыстанне метадаў нумізматыкі і фалерыстыкі для аналізу гістарычных крыніц.
7. Роля геральдыкі і генеалогіі ў вывучэнні гістарычных крыніц.
8. Суадносіны крыніцазнаўства з архівазнаўствам, музеезнаўствам і бібліяграфіяй.
9. Паняцце і прырода гістарычнай крыніцы. Суаднясенне паняццяў "гістарычная крыніца", "гістарычны дапаможнік", "гістарычнае даследаванне".
10. Суаднясенне паняццяў "рэчавая крыніца", "археалагічная крыніца", "музейны прадмет", "музейны экспанат".
11. Перадумовы зараджэння крыніцазнаўства як навукі.
12. Развіццё крыніцазнаўства ў Новы час.
13. Развіццё крыніцазнаўства ў Расійскай імперыі.
14. Развіццё крыніцазнаўства ў Навейшы час.
15. Распрацоўка тэорыі крыніцазнаўства савецкімі гісторыкамі.
16. Развіццё крыніцазнаўства гісторыі Беларусі.
17. Класіфікацыя гістарычных крыніц. Крытэрыі класіфікацыі.
18. Класіфікацыя крыніц І.Г. Дройзена і А.А. Лапо-Данілеўскага.
19. Класіфікацыя крыніц Л.М. Пушкарова і І.Д. Кавальчанка.
20. Класіфікацыя гістарычных крыніц С.О. Шмідта.
21. Сістэматызацыя гістарычных крыніц. Віды сістэматызацыі.
22. Пісьмовыя крыніцы і іх роля ў вывучэнні гісторыі. Класіфікацыя пісьмовых крыніц.
23. Помнікі эпіграфікі і графіці як спецыфічны від пісьмовых крыніц.
24. Матэрыялы заканадаўства і справаводства як гістарычныя крыніцы.
25. Актавыя і статыстычныя матэрыялы як гістарычныя крыніцы.
26. Летапісы і хронікі як гістарычныя крыніцы.
27. Мемуары, літаратурныя і публіцыстычныя творы як гістарычныя крыніцы.
28. Матэрыялы перыядычнага друку і навуковыя працы як гістарычныя крыніцы.
29. Крыніцазнаўчая эўрыстыка, яе сутнасць, мэты і задачы.
30. Бібліяграфічная эўрыстыка, яе сутнасць, мэты і задачы.
31. Асноўныя этапы бібліяграфічнай эўрыстыкі.
32. Архіўная эўрыстыка, яе сутнасць, мэты і задачы.
33. Навукова-даведачны апарат архіва. Парадак працы з архіўнымі дакументамі і правілы выкарыстання іх у гістарычным даследаванні.
34. Сетка архіўных устаноў Рэспублікі Беларусь, характарыстыка іх фондаў.
35. Асаблівасці пошуку гістарычных крыніц у сетцы "Internet".
36. Вызначэнне даставернасці электронных дакументаў і правілы выкарыстання іх у гістарычных даследаваннях.
37. Паняцце і агульная характарыстыка гістарычнай крытыкі крыніц.
38. Агульная характарыстыка знешняй крытыкі крыніц.

39. Асноўныя этапы вывучэння тэксту крыніцы. Паняцці “арыгінал”, “пратограф”, “спіс”, “рэдакцыя”.
40. Вызначэнне складанага характару тэкста крыніцы. Кантамінацыі, інтэрпаляцыі, кампіляцыі, глосы.
41. Этапы стварэння дакументаў: чарнавік, белавік, арыгінал, копія, дублікат.
42. Вызначэнне часу ўзнікнення гістарычнай крыніцы. Прадмет гістарычнай храналогіі.
43. Летазлічэнне. Тыпы і віды календароў.
44. Правілы пераводу дацiроўкі крыніц на сучасную сістэму летазлічэння. Сакавіцкі і вераснёўскі стылі летазлічэння.
45. Аналіз і сінтэз простай і ўскоснай часавай інфармацыі крыніц.
46. Методыка лакалізацыі гістарычных крыніц.
47. Методыка атрыбуцыі гістарычных крыніц.
48. Інтэрпрэтацыя гістарычнай крыніцы.
49. Мэты і задачы унутранай крытыкі крыніц.
50. Выяўленне сапраўднасці гістарычнай крыніцы. Прычыны і прыкметы падробак гістарычных крыніц.
51. Унутраная крытыка крыніцы. Паняцце даставернасці, паўнаты і дакладнасці інфармацыі крыніцы.
52. Паняцце і сутнасць сінтэзу інфармацыі крыніц.

## 5. ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ РАБОЧАЙ ПРАГРАМЫ З ІНШЫМІ ДЫСЦЫПЛІНАМІ

| Назва дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапанова аб зменах у змесце вучэбнай праграмы па вывучаемаей дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму з указанннем даты і нумару пратакола) |
|---|---|---|---|
| | | | |
| | | | |

## 6. ДАПАЎНЕННІ І ЗМЕНЫ ДА ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ ПА ВЫВУЧАЕМАЙ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

на _____/_____ вучэбны год

| №№ пп | Дапаўненні і змены | Падстава |
|---|---|---|
| | | |

Вучэбная праграма перагледжана і адобрана на паседжанні кафедры _______________________________ (пратакол № ____ от ________ 200_ г.)

Загадчык кафедры

_______________________ ________________ ____________________
(ступень, званне) (подпіс)

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дэкан факультэта

_______________________ ________________ ____________________
((ступень, званне) (подпіс)